кодзіць усталяванню ў краіне ўлады бальшавікоў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Такім чынам, дэмакратызацыя Заходняга фронту і арміі ўвогуле менш чым за год амаль цалкам разбурыла баяздольныя шматмільённыя ўзброеныя сілы краіны, паставіўшы пад пытанне далейшы ўдзел Расіі ў Першай сусветнай вайне.

**Літаратура**


1. *Белявина, В. Н.* Беларусь в годы Первой мировой войны / В.Н. Белявина. – Минск : Беларусь, 2013. – 396, [2] с. 1200 экз.
2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.; іл.
3. *Гончаров, В. Л.* 1917. Разложение армии : [сборник документов / автор-составитель В.Л. Гончаров]. – Москва : Вече, 2010. – 491, [3] с., [8] л. ил. – (Военные тайны XX века).
4. *Деникин, А. И.* Очерки русской смуты. [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: http://militera.lib.ru/memo/russian/denikin_ai2/1_06.html – Дата доступу: 23.03.2017.
5. *Латышонак, А.* Жаўнеры БНР / Алег Латышонак; [навуковы рэдактар А. Пашкевіч]. – Смаленск : Інбелкульт, 2014. – 373 с.
6. *Смольянинов, М. М.* Беларусь в Первой мировой войне, 1914–1918 гг. / М.М. Смольянинов; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 317 с., [17] л. ил.
7. *Смольянинов, М. М.* Революционное сознание солдат Западного фронта в 1917 г. / М.М. Смольянинов; под редакцией И. М. Игнатенко; Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 262, [2] с.


# ПЕРСАНАЛЬНЫЯ ДАНЫЯ Ў АРХІЎНЫХ ДАКУМЕНТАХ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ФОНДА 126 “НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ Я. КУПАЛЫ” БДАМЛМ)


**Дз. І. Варнашоў**


Кожны чалавек, калі атрымлівае медыцынскую дапамогу, уладкоўваецца на працу, выкарыстоўвае пошукавыя сістэмы ці сацыяльныя сеткі, пакідае пасля сябе пэўны аб’ём інфармацыі. З часам гэта інфармацыя назапашваецца, апрацоўваецца і трапляе ў архівы на пастаяннае ці часовае захоўванне, дзе можа быць выкарыстана ў розных накірунках. Рэспубліка Беларусь – адна з нешматлікіх краін, дзе адсутнічае галіновы закон аб ахове персанальных даных. Гэта прыводзіць да таго, што прыватныя асобы, дзяржава і бізнес бескантрольна збіраюць і выкарыстоўваюць персанальныя даныя, парушаючы падставовае права грамадзян на недатыкальнасць прыватнага жыцця.

У міжнароднай і замежнай юрыдычнай практыцы пад персанальнымі данымі разумеюць любую інфармацыю аб ідэнтыфікаванай або індэнтыфікуемай (дзякуючы гэтай інфармацыі) фізічнай асобе [1]. З масіва гэтай

інфармацыі неабходна вылучаць катэгорыю канфідэнцыйных персанальных даных. Заканадаўства замежных краін да канфідэнцыйных персанальных даных адносіць звесткі аб расавым паходжанні, нацыянальнасці, палітычных, рэлігійных, філасофскіх перакананнях, партыйнай прыналежнасці, крымінальным мінулым (звесткі аб вынесеных і выкананых судовых прысудах па крымінальных справах), генетычныя і біяметрычныя даныя. Разгалошванне гэтых звестак можа нанесці шкоду фізічнай асобе.

Пераважную частку дакументаў Установы "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва" (БДАМЛМ) складаюць фонды асабістага паходжання дзеячаў культуры Беларусі, дакументы якіх ахопліваюць перыяд XIX–XXI стст. [2]. Доступ да такіх фондаў вызначае фондаўтваральнік (альбо яго законныя спадчыннікі). Ён можна быць абмежаваны на тэрмін да 75 гадоў [3]. Адпаведна, калі доступ да фондаў адкрыты, то фондаўтваральнік зрабіў свае персанальныя даныя агульнадаступнымі.

Асноўнай групай спраў БДАМЛМ, што ўтрымліваюць персанальныя даныя, з'яўляюцца асабовыя справы работнікаў арганізацый. Сярод фондаў з такім складам хацелася б вылучыць фонд 126 "Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я.Купалы". Дакументы згаданага фонда ўключаюць загады дырэктара тэатра па асноўнай дзейнасці; штатныя расклады; пратаколы мастацкага савета, рабоча-кантрольнай камісіі, вытворчых нарад; планы работы; справаздачы; афішы, праграмы; рукапісы п'ес за 1920–2008 год. Акрамя згаданых матэрыялаў сярод спадчыны фондаўтваральніка захоўваюцца дакументы мясцовага прафсаюзнага камітэта: пратаколы пасяджэнняў камітэта, справаздачна-выбарных і агульных прафсаюзных сходаў за 1980–1987. Але найбольш цікавымі дакументамі ў межах дадзенага артыкула з'яўляюцца асабовыя справы акцёраў тэатра за перыяд з 1945 да 2009 года [4]. Паколькі большасць асабовых спраў адлюстроўваюць творчы шлях заслужаных артыстаў тэатра, то раскрыццё ганьбуючых фактаў з іх прафесійнай біяграфіі можа нанесці шкоду як светлай памяці работнікаў, так і іх родзічам. Таму падрабязней спынімся на персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў асабовых справах акцёраў.

Асабовыя справы народных і заслужаных артыстаў Дзяржаўнай установы "Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я.Купалы" утрымліваюць наступныя дакументы з персанальнымі данымі: 1) Асабісты лісток па ўліку кадраў; 2) Аўтабіяграфія; 3) Характарыстыка; 4) Даведка; 5) Даведка на выезд за мяжу; 6) Копія пасведчання аб смерці.

Асабісты лісток па ўліку кадраў змяшчае біяграфічныя даныя і звесткі аб працоўнай дзейнасці, мае трафарэтны тэкст. У дакуменце змяшчаюц-

ца наступныя персанальныя даныя: прозвішча, імя, імя па бацьку, пол, месца і дата нараджэння, нацыянальнасць, сацыяльнае паходжанне, палітычныя погляды, членства ў камуністычным саюзе моладзі і прафесійным саюзе, стан здароўя, сямейнае становішча, адукацыя, звесткі аб працоўнай дзейнасці (пералік мінулых месцаў працы і займаемых пасадаў), навуковая ступень, вучонае званне, удзел у выбарных органах, наяўнасць выездаў за мяжу, адносіны да вайсковай службы, хатні адрас. Таксама асабісты лісток па ўліку кадраў уключае персанальныя даныя сваякоў (прозвішча, імя, імя па бацьку членаў сям'і, іх узрост, ступень сваяцтва, род заняткаў). Напрыклад, "Дубошинский Павел Филипович. Дата рождения – 14.03.1931, д. Горбуны Шарковщинского р-н. Витебской обл. Национальность – белорус. Соц. происхождение – артист; Партийность – КПСС (с 1973). Трудовой опыт: с августа 1955 – актёр ТЮЗа. Семейное положение: жена – Бельская Лариса Сергеевна (1932 г.р.), сын Юрий (1960 г.р.), дочь Ирина (1966 г.р.)" [5, арк. 4–5].

Іншым цікавым дакументам з'яўляецца аўтабіяграфія. Яна у апавядальнай форме ўтрымлівае кароткае жыццеапісанне работніка, а таксама звесткі пра членаў яго сям'і. Дакумент змяшчае наступныя персанальныя даныя: прозвішча, імя, імя па бацьку, месца і дата нараджэння, звесткі аб адукацыі, досвед працоўнай і грамадскай дзейнасці. Акрамя персанальных даных уласна аўтара аўтабіяграфіі, у дакуменце маюцца звесткі пра бліжэйшых сваякоў (бацькі, муж або жонка, браты і сёстры, дзеці): іх прозвішча, імя, імя па бацьку, месца і год нараджэння, ступень сваяцтва, род заняткаў, сталае месца жыхарства. Напрыклад, аўтабіяграфія ўтрымлівае наступныя звесткі: «Филатов Валерий Николаевич, родился 8 ноября 1946 года в ГДР, г. Найштрелиц. … С 1964 года являюсь членом ВЛКСМ. После неудачного поступления в 1965 году в БГТ-ХИ (Белорусский государственный театрально-художественный институт – *аўт.*) работал мебельщиком. ... В 1970 году принят кандидатом в члены КПСС. С 1971 года член КПСС" [6, арк. 4]. "Семейное положение: жена – Бельская Лариса Сергеевна (1932), сын Юрий 1960 года рождения, дочь Ирина 1966 года рождения. Домашний адрес: г. Минск, ул. Волгоградская, дом 49, кв. 49" [5, арк. 4–5].

Характарыстыка з'яўляецца адным з асноўных дакументаў кадравага справаводства па работніках творчых прафесій. Яны складаліся ў адвольнай форме. Як правіла, характарыстыкі ўтрымліваюць наступныя персанальныя даныя: прозвішча, імя, імя па бацьку, дату нараджэння, нацыянальнасць, прыналежнасць да камуністычнай партыі, характарыстыка прафесійных якасцей, пералік адыграных роляў у тэатры. Напрыклад, "Тов. Тарасов В. П. 1934 года рождения, русский, беспар-

тийный. … Одаренный, с хорошими внешними данными, растущий молодой актёр, беспрерывно работает над повышением своего мастерства. … Он заслуживает передвижения в 1-ю категорию на оклад 1000 рублей в месяц. Получает тов. Тарасов в настоящее время 750 руб.” [7, арк. 8].

Кожная з разглежаных асабовых спраў утрымлівае даведку, якая змяшчае біяграфічныя даныя і звесткі аб працоўнай дзейнасці асобы. Яна складался на падставе асабовай справы. Дадзены дакумент прадстаўляўся па месцы патрабавання. Сама даведка мела ўніфікаваную структуру і падпісвалася кіраўніком кадравай службы арганізацыі. Дакумент уключае наступныя персанальныя даныя: прозвішча, імя, імя па бацьку, працоўны досвед (пералічэнне мінулых пасад і месцаў працы). Даведка таксама ўтрымлівае персанальныя даныя сваякоў асобы, якой выдаецца даведка: прозвішча, імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння, нацыянальнасць, месца працы, звесткі аб адукацыі (навучальная ўстанова, калі была скончана, атрыманая спецыяльнасць), членства ў камуністычнай партыі, наяўнасць партыйных спагнанняў, выязды за мяжу, мінулыя месцы працы. Напрыклад, “Алексеева Татьяна Назарьевна; должность – заслуженный артист БССР; работает в Белорусском государственном академическом театре им. Я. Купалы; дата и место рождения: 1931, г. Семипалатинск; в 1943 г. окончила музучилище, г. Ташкент; не владеет иностранными языками; имеет ли партвзыскания – нет; работа в прошлом: 1943–1945 – актриса театра музкомедии, г. Алма-Ата, … 1952 – наст. время – актриса театра им. Я. Купалы” [8, арк. 12].

У асабовых справах сустракаюцца і іншыя дакументы з персанальнымі данымі. Напрыклад, у асабовай справе Л.М. Давідовіч ёсць дакладныя запіскі, згодна з якімі актрыса не прыходзіла без паважлівых прычын на спектаклі, а таксама спазнялася на працу [9, арк. 15, 17]. У выніку ёй была аб’яўленая вымова [9, арк. 34]. Асабовая справа В.П. Тарасава ўключае копію загаду, у адпаведнасці з якой за грубае парушэнне працоўнай дысцыпліны з’яўленне на працы ў нецвярозым стане народнаму артысту СССР была аб’яўленая вымова [7, арк. 45]. Да асабовай справы П.Ф. Дубашынскага было прыкладзенае ўрачэбнае пасведчанне аб смерці [5, арк. 51]. З гэтага дакумента вынікае, што спадар П.Ф. Дубашынскі скончыў жыццё самагубствам. Таксама ў асабовых справах сустракаюцца даведкі аб заработнай плаце работніка [7, арк. 56].

Такім чынам, свабодны доступ да персанальных даных увогуле, і канфідэнцыйнай інфармацыі ў прыватнасці, парушае правы і законныя інтарэсы беларускіх грамадзян. Асабовыя справы фонду 126 “Нацы-

янальны акадэмічны тэатр імя Я.Купалы” утрымліваць кампраметуючую, медыцынскую і фінансавую інфармацыю, а таксама звесткі ацэначнага характару. Гэтыя звесткі сканцэнтраваныя ў такіх дакументах асабовых справаў, як копіі пасведчанняў аб смерці, дакладныя запіскі, загады аб вынясенні дысцыплінарных спагнанняў, даведкі аб заробнай плаце. Таму асаблівая адказнасць ускладаецца на архівістаў, якія павінны абмежаваць доступ да дакументаў, што ўтрымліваюць канфідэнцыйныя персанальныя даныя.

**Літаратура**


1. Интернет-адрес: https://rm.coe.int/1680078c46
2. Интернет-адрес: http://bdamlm.by/fond_info
3. Об архивном деле и делопроизводстве: Закон Респ. Беларусь, 25 нояб. 2011 г., № 323-З // Консультант Плюс: Беларусь [Электронны рэсурс] / ООО «ЮрСпектр». – Минск, 2017.
4. Интернет-адрес: http://fk.archives.gov.by/fond/110336/
5. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Ф. 126. – Воп.3. – Спр. 16. Дубашынскі Павел Філіпавіч 1967-2000 гг.
6. БДАМЛМ. Ф. 126. – Воп.3. – Спр. 26. Філатаў Валерый Мікалаевіч 1980-1999 гг.
7. БДАМЛМ. Ф. 126. – Воп.3. – Спр. 24. Тарасаў Віктар Паўлавіч 1957-2006 гг.
8. БДАМЛМ. Ф. 126. – Воп.3. – Спр. 7. Аляксеева Таццяна Назар’еўна 1952-1996 гг.
9. БДАМЛМ. Ф. 126. – Воп.3. – Спр. 13. Давідовіч Лілія Міхайлаўна 1960-2002 гг.


# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ГОРЕЦКОГО ЗЕМЛЕДЕЛЬЧЕСКОГО УЧИЛИЩА В 1848–1919 гг. (ПО МАТЕРИАЛАМ НАЦИОНАЛЬНОГО ИСТОРИЧЕСКОГО АРХИВА БЕЛАРУСИ)

**А. О. Гордынец**

Для обучения молодых людей разных сословий, а также распространения среди них не только теоретических, но и практических знаний по сельскому хозяйству в Горыгорецком казённом имении были учреждены учебные заведения, среди которых и земледельческое училище (ГЗУ) – первое среднее специальное учреждение аграрного профиля на территории Беларуси. За период своего существования (1848–1919) оно выпустило более 900 человек. Во второй половине XIX века это учебное и научное учреждение было центром отечественной опытной агрономии, где разрабатывались научные проблемы развития земледелия, исследовались и предлагались методы и пути ликвидации отсталости страны. Основополагающими документами его деятельности являлись Положения об открытии и преобразованиях, изменения в которых определяют этапы становления ГЗУ.

История ГЗУ берёт своё начало 30 июня 1848 года, когда император Николай I утвердил «Положение о Горыгорецком земледельческом ин-